Археалогія

**Дзяніс ДУК**

# Станаўленне Полацка ў IX—XIII стст.



*ДУК Дзяніс Уладзіміравіч — загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі Полацкага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт. Нарадзіўся ў 1977 г. у Наваполацку. У 1999 г. скончыў гістарычна-філалагічны факультэт Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Займаецца археалогіяй і гісторыяй Полаччыны, вывучае гісторыю матэрыяльнай культуры насельніцтва Полацка XVI—XVIII стст. Аўтар манаграфіі «Полацк XVI—XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада» (Наваполацк, 2007), вучэбна-метадычнага комплексу «Гісторыя Полацка: па матэрыялах археалагічных даследаванняў» (Наваполацк, 2006) і больш за 40 навуковых публікацый.*

Полацк — найстаражытнейшы беларускі горад і адзін з самых старажытных гарадоў Усходняй Еўропы. Упершыню пра яго згадваецца ў летапісе пад 862 г. пры пераліку гарадоў, якія наўгародскі князь Рурык раздаваў сваім васалам: “овому Полотескъ овому Ростовъ другому Белоозеро и по темъ городомъ суть находници Варязи а первыи насельници в Новегороде Словене [въ] Полотьски Кривичи...”[1].

Ранняя гісторыя Полацка IX—X стст. у пісьмовых крыніцах асветлена слаба. За два стагоддзі пра яго сустракаецца толькі пяць згадак у летапісах. Акрамя 862 г. Полацк згадваецца пад 865 г.: “воеваша Аскольдъ и Диръ полочанъ и много зла сътвориша”[2]. Пад 907 г. Полацк названы сярод гарадоў, дзе “седяху велиции князи под Олгом суще”[3]. Пра першага летапіснага полацкага князя Рагвалода расказваецца ў запісах пад 980 г.: “бе бо Рогъволодъ пришелъ и-заморья имяше власть свою в Полотьске”[4]. Пад тым жа 980 г. апавядаецца пра трагічныя для Полацка падзеі: “приде Володимеръ (наўгародскі князь Уладзімір Святаславіч. — **Д.Д.**) на Полотескъ и оуби Рогъволода и сына его два а дщерь его рогнедь поя за себя...”[5].

Прааналізаваўшы летапісныя паведамленні, можна зрабіць выснову, што Полацк у IX—X стст. быў значным цэнтрам у геапалітычнай сістэме ўсходніх славян. У 980 г. у Полацку княжыў Рагвалод, які з'яўляўся сапернікам наўгародскага князя Уладзіміра Святаславіча ў барацьбе за ўплыў на Кіеў.

Гісторыкаў ужо доўгі час цікавіць пытанне, на якім месцы быў заснаваны старажытны “град Полотеск”.

У 1920—1950-я гг. разгарнулася палеміка аб размяшчэнні пачатковага Полацка. На гэты конт існавалі дзве версіі: Полацк быў заснаваны 1) на так званым гарадзішчы (А.М.Ляўданскі), 2) на так званым Верхнім замку (А.Р.Мітрафанаў).

Пошукі самай старажытнай часткі Полацка — “града” крывічоў, або “прагорада” — пачаліся ў 1928 г. на этапе станаўлення археалагічнай навукі ў БССР. Першы даследчык, які не толькі выказаў думку пра тое, дзе знаходзіўся пачатковы Полацк, але і паспрабаваў абгрунтаваць яе археалагічнымі знаходкамі, быў А.Ляўданскі. Даследчык заклаў на гарадзішчы 3 траншэі і шурф агульнай плошчай 20,5 кв.м[6]. Паводле А.Ляўданскага, Полацк быў заснаваны на пагорку на выспе ў старыцы ракі Палата за 800 м ад упадзення яе ў Заходнюю Дзвіну. Пагорак размешчаны на перасечанай мясцовасці правага берага ракі. Вышыня яго ў вышэйшай кропцы дасягае 13 м, агульныя памеры складаюць 73 х 75 м. Верхняя пляцоўка меншая — 75 х 40 м і па форме нагадвае прамавугольнік з выступам ва

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Від полацкага гарадзішча з паўночнага боку. 2007 г. Фота М.Гальпяровіча.*

ўсходнім баку[7]. З 1947 г. гарадзішча шчыльна забудоўвалася, што цяпер перашкаджае правядзенню археалагічных даследаванняў на гэтым цікавым гістарычным помніку.

У пасляваенны час полацкае гарадзішча грунтоўна даследаваў Г.В.Штыхаў. У 1960 і 1962 гг. тут былі пракапаны дзве траншэі, з дапамогай якіх вызначана стратыграфія старажытных абарончых збудаванняў гарадзішча. На аснове вынікаў праведзеных археалагічных раскопак былі зроблены высновы, якія пасля выдання навуковых манаграфій Г.Штыхава "Древний Полоцк IX—XIII вв." (Мн., 1975) і С.Тарасава "Полацк IX—XVII стст: гісторыя і тапаграфія" (Мн., 1998) сталі ў беларускай гістарыяграфіі амаль што кананічнымі. Яны зводзяцца да наступнага:

1) Першае насельніцтва полацкага гарадзішча — гэта балцкія плямёны днепра-дзвінскай культуры позняга этапа яе існавання (першая палова I тыс. н. э.)[8].

2) Полацк быў заснаваны крывічамі ў VIII—IX стст. як племянны цэнтр. Да XI ст. гарадзішча з'яўлялася адміністрацыйным цэнтрам горада, месцам пражывання князя і дружыны[9].

3) У пачатку XI ст. (Г.Штыхаў[10]) або пасля будаўніцтва Сафіі ў сярэдзіне XI ст. (С.Тарасаў[11]) дзядзінец быў перанесены з гарадзішча на Верхні замак.

4) Пасля пераносу адміністрацыйнага цэнтра горада жыццё на гарадзішчы доўжылася да канца XII ст. (А.Ляўданскі[12], С.Тарасаў[13]) або да канца XIII ст. (Л.Д.Побаль[14], Г.Штыхаў[15]). Пазней гарадзішча выкарыстоўвалася як гарадскія могілкі. Паводле С.Тарасава, першае пахаванне датуецца XII ст.[16], А.Ляўданскі адносіць пахаванні на гарадзішчы да XVIII—XX стст.[17].

У 2007 г. на гарадзішчы археалагічным атрадам Полацкага дзяржаўнага універсітэта былі праведзены раскопкі. Такім чынам, праз 45 гадоў пасля раскопак Г.Штыхава самая старажытная частка Полацка зноў стала аб'ектам археалагічнага вывучэння*. Раскапаная плошча (44 кв. м) з'яўляецца самай вялікай за ўсю гісторыю археалагічнага даследавання гарадзішча**. Раскоп 1 быў разбіты побач з домам № 20 па 2-му завулку Фрунзе. Улічваючы шчыльную жылую забудову, суцэльнае археалагічнае даследаванне гарадзішча магчыма толькі пасля рэгенерацыі ўсёй яго тэрыторыі.

Сярэдняя магутнасць культурнага пласта на гарадзішчы складае 1,8 м, у паўночнай частцы яна дасягае 4 м. На месцы раскопу 1 магутнасць пласта роўная 3 м. Да мацерыка пласт быў раскапаны на плошчы 22 кв. м.

У выніку даследавання 2007 г. былі атрыманы даныя, важныя для інтэрпрэтацыі ранняй гісторыі Полацка. Выказаныя раней палажэнні адносна ролі і месца гарадзішча ў гісторыі Полацка патрабуюць істотнай карэкціроўкі. Можна цалкам пагадзіцца з высновай, што першае насельніцтва полацкага гарадзішча прадстаўлялі балцкія плямёны днепра-дзвінскай культуры. Аднак пласт, пакінуты гэтым насельніцтвам, адпавядае ранняму этапу існавання днепра-дзвінскай культуры (другая палова першага тысячагоддзя да н.э. — пачатак першага тысячагоддзя н.э.). Пасля прыходу славян, найбольш верагодна ў IX ст. і не пазней за X ст., гарадзішча выкарыстоўвалася для пражывання князя, дружыны і пэўнага кола рамеснікаў — ювеліраў і збройнікаў — да канца XIII ст.

У раскопе 1 пахаванняў больш ранніх за XVII ст. не выяўлена. Гэта дае падставы лічыць, што жано-

* Шурфоўка гарадзішча Л.Побалем,назіранні за земляными работамі Вал.В.Булкіна і С.Тарасава ў дадзеным выпадку ў разлік не прымаюцца.

** За ўвесь час археалагічнага вывучэння гарадзішча сумарна ўскрытая плошча склала каля 80 кв.м.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чае пахаванне, выпадкова раскапанае мясцовымі жыхарамі і даследаванае С.Тарасавым у 1987 г., адзінкавае. Думка даследчыка пра тое, што гэта пахаванне знаходзілася каля царквы на гарадзішчы[18], заслугоўвае асаблівай увагі. Патрабуе значнай карэляцыі і датаванне пахавання — XII ст. Яно магло быць здзейснена ў XII—XIV стст., таму што знойдзеныя ў пахаванні рэчы бытавалі на працягу значнага прамежку часу.

Падчас раскопак 2007 г. выяўлена больш за 30 некранутых або нязначна пашкоджаных пахаванняў, якія датуюцца XVII—XVIII стст. Пахаванні належалі полацкай шляхце каталіцкага веравызнання. Пра гэта сведчаць рэчы, знойдзеныя на целах памерлых (нацельныя крыжы і іконка), і размяшчэнне могілак у цэнтры горада. На могілках выяўлены пахаванні мужчын, жанчын і дзяцей. Пахаванні зроблены ў аднародным пласце зямлі, які ўтварыўся ў XIII ст.

Пахаванні больш позняга часу (XIX—пачатку XX ст.) зроблены неглыбока і захаваліся ў пашкоджаным выглядзе. Паводле звестак краязнаўца І.П.Дэйніса, у пачатку XX ст. тут хавалі самазабойцаў[19].

На аснове раскопак 2007 г. можна з вялікай доляй упэўненасці сцвярджаць, што гарадзішча з'яўлялася месцам пражывання князя і размяшчэння княжацкага двара да канца XIII ст. Пасля завяршэння камеральнай апрацоўкі рэчавага матэрыялу гэтая дата можа быць скарэкціравана да XIV ст.

З часу будаўніцтва Сафіі на Верхнім замку жыццё на гарадзішчы не спыняецца. Наадварот, найбольш значныя археалагічныя знаходкі, якія сведчаць пра статус паселення, датуюцца менавіта XII—XIII стст. У пласце гэтага часу знойдзена вялікая колькасць прадметаў побыту і высокамастацкіх вырабаў. Гэта сведчыць пра тое, што князь з дружынай па-ранейшаму жыў на гарадзішчы, а Верхні замак з яго культавай і грамадзянскай забудовай выкарыстоўваўся для адміністрацыйна-цырыманіяльных мэт.

Пра засяленне гарадзішча прынамсі да XII ст. сцвярджаў першы даследчык полацкага гарадзішча А.Ляўданскі. Вучоны абапіраўся выключна на археалагічны матэрыял. Няглядзячы на тое, што меркаванне пра перанос рэзідэнцыі князя ў XI ст. на Верхні замак археалагічна ніяк не падмацавана, гэты тэзіс пачынаючы з грунтоўнай працы М.М.Ціхамірава шырока прадстаўлены ў навуковай літаратуры[20]. Лічыцца, што Верхні замак быў акружаны магутнымі абарончымі сценамі. Аднак на сённяшні дзень археалагічна не выяўлена выразных слядоў абарончых збудаванняў Верхняга замка XI—XIII стст.[21]. На думку С.Тарасава, яны тым не менш павінны былі існаваць[22]. Вядомы расійскі даследчык Л.В.Аляксееў развівае гэтую думку далей і адзначае, што менавіта пры Усяславе Брачыславічу (1044—1101 гг.) была пабудавана "магутнейшая крэпасць на Замкавай гары ў Полацку, падобна той, якую ўзвёў яго сын на верхняй Свіслачы, назваўшы Мінскам"[23].

На нашу думку, Верхні замак у разглядаемы перыяд не меў значных абарончых збудаванняў і быў уключаны ў агульную сістэму пасадскай фартыфіка-




*План і разрэз першапачатковага гарадзішча Полацка (па Ю.А.Ягораву) з пазначэннем (Р 1) месца правядзення раскопак у 2007 г.*



*Падчас раскопак у 2007 г.*
Фота М.Гальпяровіча.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова

цыі, якая існавала з XI ст. і была досыць разгалінаваная. Вялікі пасад быў акружаны драўлянымі сценамі — гароднямі, умацаванымі камянямі каля падэшвы, а запалоцкі — вастраколам. Відаць, драўляны вастракол акружаў і Верхні замак, аднак гэтыя ўмацаванні не маглі параўнацца з высокім валам і гароднямі гарадзішча. Ускоснымі доказамі адсутнасці на Верхнім замку магутных умацаванняў з'яўляюцца вялікі культурны пласт і характар забудовы яго ўсходняй часткі на месцы так званага ўсходняга раскопу 1956, 1959—1960 гг. У XI—XIII стст. гэтая тэрыторыя з'яўляецца пасадскай і была ўключана ў склад Верхняга замка не раней за XIV ст.

Падчас археалагічных даследаванняў Верхняга замка менавіта ва ўсходняй частцы зафіксаваны рэшткі крапасной сцяны. Малаверагодна, што яна магла праходзіць каля падэшвы пасадскай тэрыторыі. З улікам інтэнсіўнага нарастання культурнага пласта ўсходняя частка была вышэйшая за асноўную пляцоўку Замчышча. А вось у XIV—XVI стст. гэтая тэрыторыя ўвайшла ў склад Верхняга замка і па перыметру з вонкавага боку была абнесена драўляна-каменнымі ўмацаваннямі. Іх сляды ў заходняй[24] і паўднёвай частцы[25] Верхняга замка зафіксаваны археолагамі С.Тарасавым і Вал.Булкіным і адзначаны ў пісьмовых крыніцах.

Такім чынам, Верхні замак у XI—XIII стст. наўрад ці меў магутную сістэму крапасных умацаванняў. У гэтым не было вялікай патрэбы, улічваючы наяўнасць разгалінаваных умацаванняў пасадаў і адсутнасць на Верхнім замку княжацкага двара. І нават той факт, што з XIII ст. на Верхнім замку размяшчаюцца двор полацкіх епіскапаў[26], церам, а ў Сафійскім саборы захоўваюцца гарадская казна і бібліятэка, не можа з'яўляцца доказам пераносу княжацкага двара на Верхні замак без археалагічнага падмацавання. На гарадзішчы Г.Штыхавым былі даследаваны рэшткі ўмацаванняў — вала, драўляных канструкцый і каменных адмостак. Да сённяшняга дня з паўночнага боку гарадзішча захаваліся выразныя сляды вала і дзвюх тэрас каля яго падэшвы. Гэтыя тэрасы, магчыма, з'яўляюцца рэшткамі старажытнага ўезда на гарадзішча. Такім чынам, княжацкая рэзідэнцыя была надзейна ўмацавана.

Храналогія старажытнасцей з ніжніх пластоў полацкага гарадзішча і сінхронных яму пасяленняў — паселішча і перадграддзя сумарнай плошчай крыху больш за 6 га — мае шырокія рамкі[27]. У раскопах і шурфах былі знойдзены рэшткі ляпных гаршкоў, аналагічных посуду культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў канца VIII—X ст. Большасць вырабаў з чорных і каляровых металаў, знойдзеных у ніжніх пластах полацкага гарадзішча і паселішчах, ужывалася з IX па XI ст. Артэфактаў, якія давалі б магчымасць больш дакладнага датавання, на гарадзішчы не выяўлена. Выключэннем з'яўляецца знаходка $^1/_4$ часткі сярэбранай манеты — куфіцкага дырхема[28]. Гэты дырхем быў знойдзены Вас.Булкіным у 1978 г. падчас капання мясцовымі жыхарамі катлавана пад склеп. Яго аналіз быў зроблены ў Дзяржаўным Эрмітажы (Санкт-Пецярбург)[29] і В.Н.Рабцэвічам[30]. У артыкуле В.Рабцэвіча адзначаецца, што дырхем быў знойдзены Вал.Булкіным падчас даследавання Сафійскага сабора. На самай справе гэты дырхем паходзіць з полацкага гарадзішча. Такая недакладнасць узнікла з-за таго, што інфармацыя пра дырхем была ўключана ў справаздачу Вал.Булкіна пра даследаванне Сафійскага сабора. Гэты дырхем належыць да аббасідскай эмісіі (паміж 814/815 г. — канцом IX ст.).

Такім чынам, выяўленыя артэфакты з ніжніх пластоў полацкага гарадзішча не супярэчаць меркаванням пра магчымасць існавання тут Полацка ў 862—865 гг., як і не даюць дакладнага пацвярджэння. Пошукі "альтэрнатыўнага" гарадзішчу пачатковага цэнтра Полацка IX ст. на сённяшні дзень застаюцца безвыніковымі, затое полацкія археолагі прадставілі новыя даныя пра характар развіцця гарадской тапаграфіі ў XI—XIII стст. Полацкае гарадзішча рэальна застаецца аб'ектам нумар адзін у пошуках адказу на пытанне: дзе і як быў заснаваны старажытны Полацк?

Стратыграфія пласта раскопу 1 вельмі стракатая. Гэты пласт папярэднічае напластаванням жалезнага веку і знаходзіцца ніжэй за ўзровень зямлі са знаходкамі XI—XIII стст. На нашу думку, гэта культурны пласт Полацка IX—X стст. Магутнасць пласта 0,4—0,6 м. У ім зафіксаваны шматлікія праслойкі пажарышча. Тут знойдзена ляпная кераміка і іншыя рэчы культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў, і менавіта тут захаваліся стратыграфічныя гарызонты старэйшыя за X ст. Пацвердзіць выказаныя меркаванні магчыма ў бліжэйшы час метадам радыевугляроднага аналізу.

Вынікі сёлетніх раскопак цалкам пацвярджаюць выказаную Г.Штыхавым здагадку: першапачатковы Полацк быў заснаваны на месцы закінутага гарадзішча днепра-дзвінскай культуры. З сярэдзіны IX ст. гарадзішча пры вусці Палаты стала не проста "градам", але сталіцай аднаго з самых значных усходнеславянскіх княстваў.

Узнікае пытанне: чаму і Віцебск, і Лукомль, ужо абжытыя да IX ст. балцкія пасяленні, не сталі племяннымі цэнтрамі крывічоў? Адказ уяўляецца верагодным, калі ўлічыць этнічную сітуацыю на тэрыторыі Беларускага Падзвіння ў канцы I тыс. н.э. У момант прыходу славян на шматлікіх стратэгічна важных, вузлавых пунктах ужо існавалі абарыгенныя гарадзішчы балтаў. Да ліку апошніх належалі Віцебск і Лукомль. Таму гарадзішча пры вусці Палаты як месца сталіцы новага ўсходнеславянскага княства было створана па адной галоўнай прычыне: адсутнасць аўтахтоннага балцкага насельніцтва давала магчымасць племяннной вярхушцы славян стварыць новы адміністрацыйны цэнтр. Невыпадкова ў 862 г. Полацк ужо згадваецца як цэнтр воласці, у якой пачаў княжыць адзін з васалаў Рурыка.

Паступова Полацк становіцца вядомым далёка за межамі Беларускага Падзвіння. Як жа гэта было дасягнута? Толькі сілай ваеннага падпарадкавання



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ці іншым шляхам? Археалагічных доказаў відавочнага ўзброенага супрацьстаяння на тэрыторыі Беларускага Падзвіння няма. Тут адсутнічаюць пасяленні, якія ўтрымліваюць пласты пажарышчаў са слядамі ваенных дзеянняў часоў рассялення славян у VIII—IX стст. Такія сляды досыць тыповая з'ява для Верхняга Падняпроўя і шэрага сумежных зямель.

Можна выказаць меркаванне пра станаўленне Полацка як рэгіянальнага палітычнага цэнтра ў выніку дамоўных, саюзных міжплямянных адносін паміж аўтахтонамі-балтамі і прышлымі славянамі (крывічамі?). Усе ключавыя месцы ў кіраванні новым дзяржаўным утварэннем займалі менавіта славяне — Полацк вызначаў статус-кво ў Падзвінскім рэгіёне з усёй відавочнасцю.

Пра багацце рэчавага інвентару, знойдзенага на полацкім гарадзішчы, варта сказаць асобна. Падчас археалагічных раскопак 2007 г. былі выяўлены унікальныя артэфакты, якія праліваюць святло на некаторыя аспекты жыццядзейнасці бліжэйшага княжацкага акружэння.

Стратыграфічны гарызонт XII—XIII стст. раскопу 1 з'яўляецца самым вялікім, яго магутнасць у сярэднім складае 1,5—2 м. Верхні пласт на глыбіню 1,5 м моцна пашкоджаны познімі пахаваннямі. На глыбіні 1,5—2 м знойдзена асноўная колькасць рэчаў X—XIII стст., сярод якіх ганчарная кераміка, шкляныя бранзалеты (XII—першай трэці XIII ст.), пацеркі, бытавыя металічныя вырабы, прадметы ўзбраення, упрыгожанні і дэталі вопраткі з каляровых металаў, царкоўнае начынне, вырабы з косці, бурштыну і каменя. Лакалізаваны ювелірная майстэрня (кавалкі тыгляў, прылады ювеліра, сыравінны запас), а таксама зброевая майстэрня, якая спецыялізавалася на вырабе пласціністых наборных даспехаў.

Сабраная калекцыя мае і рарытэтныя знаходкі. Так, у раскопе 2007 г. у верхнім перакапаным пласце зямлі была знойдзена адваротная створка меднага крыжа-энкалпіёна (машчавіка). Падобныя крыжы належаць да тыпу так званых барысаглебскіх энкалпіёнаў (варыянт 1 паводле Г.Ф.Карзухінай і А.А.Пясковай), час існавання іх ахоплівае XI—пачатак XIII ст.[31]. Кананічна на вонкавай створцы змяшчалася выява князя Барыса, на адваротнай — Глеба, хоць вядомы і варыянты[32]. Уладальнікамі крыжоў-энкалпіёнаў былі вялікія князі, дружыннікі, купцы[33]. Крыж мае памеры 5,2 х 7,1 х 0,4 см (з завесамі), 5,2 х 6 см (без завес). Выява барэльефная, захаванасць крыжа добрая.

Першасная адліўка энкалпіёнаў падобнага тыпу адбывалася ў Кіеве з канца XI ст. У некаторых усходнеславянскіх землях вядомы мадыфікаваныя адліўкі па прывезеных з Кіева ўзорах. Да ліку такіх адлівак належыць створка крыжа, знойдзеная на полацкім гарадзішчы. Крыж з аналагічнай выявай знойдзены падчас раскопак у Вялікім Ноўгарадзе ў пабудове 1135 г. (памер 5 х 5,8 см)[34].

Ёсць падставы меркаваць, што знойдзены на гарадзішчы крыж быў выраблены ў Полацку ў часы княжання Барыса Усяславіча (1127—1128 гг.), аднаго з сыноў легендарнага Усяслава Брачыславіча. У першай трэці XII ст. у Полацку актыўна распаўсюджваецца культ Барыса і Глеба, у прыгараднай мясцовасці Бельчыцы на левым беразе Дзвіны будуецца Барысаглебскі княжацкі манастыр з велічным саборным храмам.

Выява на створцы полацкага крыжа добра чытаецца, маюцца нязначныя сляды пацёртасці ліку святых з-за працяглага нашэння крыжа. У цэнтры кампазіцыі змешчана выява князя ў поўны рост. У левай руцэ князь трымае мадэль храма як сімвал веры. Храм прадстаўлены трохапсідным і мае прысадзістыя прапорцыі. Верагодна, у аснову выявы храма быў пакладзены Сафійскі сабор. Але які?

З трох вядомых на Русі Сафій (Кіеўскай, Наўгародскай, Полацкай) полацкая і наўгародская мелі па тры апсіды*, значыць, кіеўскі храм з пяццю апсідамі за аснову выявы на крыжы не мог быць прыняты. І хоць фармальна выява храма найбольш адпавядае полацкай Сафіі**, усё ж мадэль храма ў руцэ князя — гэта выява традыцыйнага праваслаўнага пяцігаловага храма, які сімвалізаваў уваскрашэнне Хрыста і чатырохевангелле.

У выяве князя майстар старанна перадаў усе дробныя дэталі вопраткі (на правым плячы князя — фібула, на галаве — княжацкі вянец, відаць спадаючыя складкі плашча). Зверху ў медальёне змешчана выява Маці Божай, выразна відаць мафорый, у баквых медальёнах размешчаны крыху меншыя па памеры выявы святых.

Падчас раскопак былі выяўлены артэфакты, якія сведчаць аб пражыванні на гарадзішчы князя і баяр. Сярод знаходак — бронзавая літая накладка. Яна мае форму роўнабаковага трохвугольніка, выгнутага па вертыкальнай восі (памер бакоў роўны 10 см). Гэты прадмет з'яўляўся адной з частак кампазіцыі з некалькіх, магчыма, аналагічных па сюжэце, накладак. Выява барэльефная, вышыня адліўкі 0,3 см. Можна выказаць меркаванне, што некалькі падобных накладак атачалі драўляную чару. Дэфармацыя верхняй часткі вырабу не дазваляе вызначыць дыяметр чары.

Мацавалася накладка з дапамогай металічных штыфтаў да ніжняга боку венца драўлянай чары і да прыдоннай часткі сценкі. На гэта ўказваюць адтуліны ў верхняй частцы вырабу, а таксама адтуліна са штыфтам у ніжнім вугле. Выява грыфона з'яўлялася свайго роду абярэгам чары, прызначанай, верагодна, для сталавання князя або яго бліжэйшага асяроддзя. Не выключана, аднак, прызначэнне чары для царкоўных мэт. Раслінны арнамент сімвалізуе Дрэва Жыцця — архетып найстаражытнейшага сакральнага сюжэту.

Найвыдатнейшымі творамі дробнай мастацкай пластыкі з'яўляюцца знойдзеныя падчас раскопак

* Пазнейшыя прыдзелы Наўгародскай Сафіі ў разлік не прымаюцца.

** Існуе меркаванне, што пачатковы сабор XI ст. у Полацку меў пяць купалаў, у XII ст., падчас другога этапа будаўнічых работ, да іх былі дабудаваны яшчэ два.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Кіvotны крыж з Севастопаля (Херсанеса).*

адлітыя бронзавыя фігуркі Багародзіцы і апостала Іаана, якія аплакваюць Хрыста (сюжэт распяцця на крыжы). Фігуркі адлітыя ў форме, малюнак барэльефны, вышыня адліўкі 0,4—0,6 см. Вышыня фігуркі Багародзіцы — 8 см. У фігуркі апостала адсутнічае галава, але захавалася ніжняя частка (мацаванне), што ўсё разам мае вышыню 8 см. Абедзве фігуркі размяшчаліся на кіvotным крыжы. Аснова кіvotнага крыжа з цалкам аналагічнай фігуркай Прадстаячай Багамацеры была знойдзена ў 1940 г. у Севастопалі (Херсанесе). Асобная фігурка Іаана была знойдзена на Шапятоўскім гарадзішчы ў Хмяльніцкай вобласці (Украіна), яна датуецца першай паловай XIII ст.[35] Дзве фігуркі, выяўленыя на полацкім гарадзішчы, — трэцяя знаходка ў гэтым шэрагу і мае вялікую археалагічную каштоўнасць. Як лічыць вядомы расійскі даследчык В.Г.Пуцко, кіvotны крыж быў адліты ў Кіеве візантыйскім майстрам. Аднак, на нашу думку, не выключана мясцовая (полацкая) адліўка абедзвюх фігурак. На карысць гэтага гавораць шматлікія абломкі тыгляў, знойдзеныя ў стратыграфічным пласце XII—XIII стст.

Сярод рарытэтных знаходак можна вылучыць бронзавую дэталь хораса з двухбаковым плеценым арнаментам (памер 10 х 3,5 см) і навершша даўжынёй 8,2 см, верагодна, ад гарызантальнай планкі харугвы.

На полацкім гарадзішчы была знойдзена бронзавая фібула. Раней гэты выраб, які не мае аналагаў на тэрыторыі Беларусі, быў намі вызначаны як прадукцыя майстэрняў вострава Готланд (летапісны Гоцкі бераг)[35]. Гэтая выснова грунтавалася на наяўнасці аналагічных па форме готландскіх фібул X—XI стст. Аднак пасля зробленага ў Полацку вядомым шведскім археолагам Інгмарам Янсанам візуальнага аналізу вырабу шведскае паходжанне фібулы было пастаўлена пад сумненне. І.Янсан выказаў меркаванне, што гэты выраб быў зроблены візантыйскім майстрам у XI—XIII стст. — пра гэта, на думку вучонага, сведчаць канструкцыйныя і дэкаратыўныя элементы фібулы: шырыня завесы, на якой язычок фібулы замацаваны на дужцы, характар зааморфнага дэкору галовак фібулы і арнамент пляцення дужкі.

Значнай знаходкай з'яўляецца таксама прасліца, выробленае з шыфернага сланцу, на якім нанесены кірылічныя літары Н, Ѧ, М, Г. Варта адзначыць і знаходкі фрагментаў плінфы з рошчынай, смальты, кавалкаў свінца, а таксама кавалкаў рошчыны-цамянкі ў стратыграфічным пласце XI—XIII стст. Пра рэшткі плінфы на полацкім гарадзішчы згадвалі А.Ляўданскі[37] і Л.Побаль[38]. Разам з прадметамі царкоўнага прызначэння (медны крыж-энкалпіён, бронзавыя донца лампадкі, фігуркі святых з кіvotнага крыжа, дэталь пэндзля, якім размалёўваліся іконы і інш.) дадзеная катэгорыя вырабаў сведчыць пра наяўнасць на гарадзішчы яшчэ аднаго храма полацкай архітэктурнай школы XII ст. Гэты храм размяшчаўся дзесьці побач з раскопам 1 у паўночнай частцы гарадзішча. Дадатковымі аргументамі з'яўляюцца знаходкі рэшткаў плінфы ў траншэі № 2 А.Ляўданскага і

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



*Прасліца з кірылічным надпісам.*

шурфе № 1 Л.Побаля, а таксама сярэдневяковае жаночае пахаванне, выяўленае менавіта ў паўночнай частцы гарадзішча.

Няма сумненняў — полацкае гарадзішча з'яўляецца унікальным археалагічным помнікам. Менавіта на гарадзішчы размяшчаўся княжацкі двор полацкіх Ізяславічаў, Рагвалодавых унукаў. Тут жыў разам з баярамі, слаўнымі мужамі-палачанамі, Усяслаў Брачыславіч і многія яго знакамітыя нашчадкі. Датаванне адкрытых ніжніх пластоў полацкага гарадзішча прыродазнаўчанавуковымі метадамі — справа найбліжэйшай будучыні. Спадзяёмся, што ў выніку ўсебаковых палявых і камеральных археалагічных даследаванняў стане магчымым вызначыць пласт пажарышча 980 г., а таксама і больш раннія сляды існавання Полацка IX ст. І тады Рагвалодава гарадзішча стане прызнаным гістарычным фактам.

---

[1] Полное собрание русских летописей (далей — ПСРЛ). Т. 1. М., 1962. Стб. 20.

[2] Там жа. Т. 9—10. М., 1965. С. 9.

[3] Там жа. Т. 1. Стб. 31.

[4] Там жа. Стб. 76.

[5] Там жа.

[6] Ляўданскі А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе // Запіскі аддзелу Гуманітарных навук БАН. Кн. 2. Працы археолёгічнай камісіі. Т. 2. Мн., 1930. С. 163—165.

[7] Штыхов Г.В. Древний Полоцк IX—XIII вв. Мн., 1975. С. 21.

[8] Там жа. С. 24.

[9] Там жа. С. 21, 26, 130.

[10] Там жа. С. 33.

[11] Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. Мн., 1998. С. 37.

[12] Ляўдансі А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе. С. 169.

[13] Тарасов С.В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 году // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Воп. 1, спр. № 1014. С. 23.

[14] Поболь Л.Д. Отчет об исследовании археологических памятников в г. Полоцке в 1959 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Воп. 1, спр. № 594. С. 4—5.

[15] Штыхов Г.В. Древний Полоцк IX—XIII вв. С. 26.

[16] Там жа.

[17] Ляўдансі А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе. С. 163—164.

[18] Тарасов С.В. Отчет о раскопках в Полоцке и Полоцкой округе в 1987 году. С. 22—23.

[19] Дейнис И.П. Полоцкая старина (исторические места и памятники старины г. Полоцка). Полоцк, 1978 (рукапіс) // Фонды НПГКМЗ, кп-2, № 1422/8. С. 14.

[20] Тихомиров М.Н. Древнерусские города. М., 1956. С. 26.

[21] Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. С. 40—41.

[22] Там жа. С. 93.

[23] Алексеев Л.В. Западные земли домонгольской Руси: очерки истории, археологии, культуры: В 2 кн. Кн. 1. М., 2006. С. 103.

[24] Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. С. 41.

[25] Булкин В.А. Отчет об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 году // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Воп. 1, спр. № 594. С. 9—11.

[26] Тарасаў С.В. Полацк IX—XVII стст.: гісторыя і тапаграфія. С. 68.

[27] Плавінскі М.А., Штыхаў Г.В. Ляпная кераміка Полацкага селішча // Гістарычна-археалагічны зборнік. 2005, № 21. С. 66.

[28] Булкин В.А. Отчет об археологических исследованиях Софийского собора и прилегающих к нему территорий в 1978 году. С. 17—18.

[29] Там жа.

[30] Рябцевич В.Н. Дирхамы арабского халифата в денежном хозяйстве Полоцкой земли // Славяне и их соседи: Археология, нумизматика, этнология. Мн., 1998. С. 73.

[31] Корзухина Г.Ф., Пескова А.А. Древнерусские энколпионы. Кресты-реликварии XI—XIII вв. СПб., 2003. С. 87.

[32] Там жа. С. 88.

[33] Там жа. С. 39.

[34] Там жа.

[35] Там жа. С. 193—194, 412.

[36] Дук Д. Древо жизни Полоцкого городища // Родина. 2007, № 10. С. 37—39.

[37] Ляўдансі А.М. Археолёгічныя досьледы ў Полацкай акрузе. С. 164.

[38] Поболь Л.Д. Отчет об исследовании археологических памятников в г. Полоцке в 1959 г. // Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Воп. 1, спр. № 594. С. 2.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова